# «ДАРОГІ, СЦЕЖКІ, КРАЯВІДЫ»

**(105 гадоў з дня нараджэння Аляксея Пысіна)**





(1920-1981)

**Аляксей Васілевіч Пысін — беларускі паэт, перакладчык, журналіст, заслужаны работнік культуры БССР. Член Саюза пісьменнікаў Беларусі з 1950 года.**

# БІЯГРАФІЯ І ТВОРЧАСЦЬ АЛЯКСЕЯ ПЫСІНА



Нарадзіўся ў сялянскай сям’і. У 1938 годзе паступіў у Камуністычны інстытут журналістыкі імя Кірава ў Мінску. З другога курса быў накіраваны на працу ў рэдакцыю Бельскай раённай газеты на Беласточчыну. У 1941-1945 гадах у Чырвонай Арміі.

З 1946 года працаваў у раённым друку, у абласной газеце «Магілёўская праўда». Скончыў Вышэйшыя літаратурныя курсы пры СП СССР у Маскве. Член Саюза пісьменнікаў СССР з 1950 года.




**Ужо ў школьныя гады Аляксей Пысін робіць першыя крокі ў паэзіі. Ён, вучань сямігодкі, з’яўляўся актыўным селькорам раённай газеты «Чырвоная змена». Менавіта ў ёй у 1938 годзе апублікаваў свой першы верш «Ураджай».**

**Першая кніга «Наш дзень» пабачыла свет у 1951 годзе. Вучнёўскія вершы ў яе не трапілі, а ўвайшлі лепшыя творы паэта, напісаныя пасля вайны. Паэзія Аляксея Пысіна аўтабіяграфічная. Побач з матывамі барацьбы за мір на зямлі вялікае месца ў кнізе займаюць творы, у якіх услаўляюцца людзі-працаўнікі. Наступныя яго зборнікі «Сіні ранак», «Сонечная паводка».**






**Сапраўднае нараджэнне Аляксея Васільевіча Пысіна як паэта пачалося са зборніка «Мае мэрыдыяны», затым ішла кніга «Твае далоні», што прынесла заслужанае прызнанне. Былі выдадзены і іншыя кнігі: «Пойма», «Да людзей ідучы», «Вярбовы мост», «Вершы», «Ёсць на свеце мой алень» і інш. У гэтых творах разгортваецца суровы летапіс памяці. Драматызм ваеннага часу складае аснову перажывання паэта, ён па-свойму адлюстроўвае вайну, высвятляючы духоўны і маральны змест падзей.**





У ліра-эпічных паэмах «Белы камень», «Кара», «Жураўліны бераг» паэт паказвае вернасць роднай зямлі. Надрукаваў кнігу паэзіі пра народныя песні і іх выканаўцаў «Бярозка ля кожных варот».

Аляксей Васільевіч нямала напісаў і спецыяльна для маленькіх. Гэта зборнікі вершаў для дзяцей «Матылёчкі-матылі», «Вясёлка над плёсам», «Кавылёк», паэмы «Дзяўчынка Марыям», «Колькі сонцаў!», «Аляксей, Дзяніс, Алёнка». Аляксей, Дзяніс, Алёнка — імёны ўнукаў паэта. Іх ён вельмі любіў, з іх жыцця браў сюжэты для вершаў.





У 1980-1989 гадах былі выдадзены Выбраныя творы Аляксея Пысіна ў двух тамах. У іх ўвайшлі лепшыя творы аўтара: вершы, паэмы, казкі для дзяцей.

Уся паэзія Аляксея Пысіна — вобразная, глыбока эмацыянальная і задушэўная, прымушае чытача думаць, перажываць, разважаць над перажытым, заклікае тварыць і жыць.



# ТВОРЫ АЛЯКСЕЯ ПЫСІНА Ў БІБЛІЯТЭЦЫ ІМЯ Д.Р. НОВІКАВА




**П 956 з. т. / 1**
**Пысін, А. В.**
**Збор твораў : у двух тамах / А. Пысін. – Мінск : Мастацкая літ.**
**Т. 1 : Вершы / уклад. В. Ракаў ; аўт. Прадм. В. Карамазаў. – 1989. – 399 с.**

**У першы том збору твораў беларускага пісьменніка увайшлі паэтычныя творы з 1946-1981 гг.**




**П 956 з. т. / 1**
**Пысін, А. В.**
**Збор твораў : у двух тамах / А. Пысін. – Мінск : Мастацкая літ.**
**Т. 2 : Паэмы, творы для дзяцей, пераклады. – 1989. – 254 с.**

**У другі том збору твораў увайшлі паэмы, творы для дзяцей і пераклады вершаў Мусы Джаліля і Міхаіла Ханінава.**




Пысин, А. В.
Меридианы : Стихи и поэмы / Авториз. пер. с белорус. Г. Пагирева ; [Ил.: Э. Е. Миронова]. – Ленинград : Сов. писатель. Ленингр. отд-ние, 1968. – 151 с.




**П 956 с. д.**
**Пысин, А. В.**
**Сердцем добрым : избранная лирика. [Пер. с белорус.] А. Пысин / [Вступ. ст. М. Стрельцова]. – Минск : Мастацкая літаратура, 1985. – 191 с.**




П 956 е. н.
Пысин, А. В.
Есть на свете мой олень : стихи. Пер. с белорус. / А. Пысин; [Худож. А. Д. Мухина. – Москва : Сов. писатель, 1983. – 112 с.




**П 956 э.**

**Пысин, А. В.**

**Эхо : стихи / А. Пысин. – Авториз. пер. с белорус. Н. Сидоренко. – Москва : Сов. писатель, 1960. – 102 с**

# Літаратура аб Аляксее Пысіне




**928**
**П 956 б. п.**
**Пысін, А. В.**
**Бібліятэка паэта Аляксея Пысіна : нарыс / А. В. Пысін, В. І. Арцем’еў. – Магілёў : [б. и.], 2011. – 40 с.**

**Беларускі пісьменнік Віктар Арцем’еў – напісаў дакументальны нарыс пра бібліятэку паэта Беларусі А. В. Пысіна, з якім у яго было шчырае сяброўства на працягу 26 гадоў.**

928
П 956 в. а.
Пысін, А. В.
Вянок Аляксею Пысіну : зборнік / укл. В. І. Арцем'еў. – Магілёў : Магілёўская абласная ўзбуйненая друкарня імя Спірыдона Собаля, 2006. – 111 с.




У зборніку «Вянок Аляксею Пысіну» змешчаны ўспаміны вядомых пісьменнікаў пра А. Пысіна, вершы, прысвечаныя знанаму Майстру паэтычнага слова. Сваімі шчырымі радкамі ўсе яны намалявалі яркі партрэт Паэта, вернага сына сваёй Айчыны. Кожны, хто прачытае «Вянок»,убачыць вобраз паэта-воіна, як аддаў увесь жар свайго сэрца людзям, падарыў ім свае таленавітыя кнігі.




**928**
**П 956 п. в.**
**Пысін, А. В.**
**Паэт вузел завязаў: успаміны і роздум пра жыццё і творчасць А. В. Пысіна : зборнік / А. В. Пысін, В. І. Арцем’еў. – Магілёў : Магілёўская абласная ўзбуйненая друкарня імя Спірыдона Собаля, 2008. – 71 с.**

**Зборнік «Паэт вузел завязаў» змяшчае ўспаміны і роздум пра жыццёвы і творчы шлях выдатнага беларускага паэта А. В. Пысіна, якімі шчыра дзеліцца з чытачом яго сябр і даследчык паэзіі Віктар Арцем’еў.**




**928**
**П 956 п. а.**
**Пысін, А. В.**
**Пысіны: ад прадзеда да праўнукаў / В. І. Арцем’еў. – Магілёў : АмелияПринт, 2011. – 43 с.**

**Пісьменнік Віктар Арцем’еў на аснове ўспамінаў родных і сяброў паэта ў зборніку ўпершыню паказаў радаводныя карані нацыянальнаа паэта Беларусі Аляксея Пысіна ад прадзеда-казака Арцема Паўлавіча Пысіна да праўнукаў паэта. Змешчаны фатаздымкі з архіваў сем’яў Пысіных і аўтара зборніка.**




**82-43**
**А 881 у. а.**
**Арцем’еў, В. І.**
**Урокі Аляксея Пысіна : гісторыі выршаў, нарысы / В. І. Арцем’еў. – Магілёў : [б. и.], 2013. – 88 с.**

**У зборніку «Урокі Аляксея Пысіна» змешчаны гісторыі асобых вершаў, якія стварыў паэт-класік Аляксей Пысін, а таксама, нарысы пра яго жыццё і творчасць. Іх аўтар – сябар паэта, ягоны біёграф. Кніга мае значную мастацкую і гістарычную каштоўнасць.**

# «ДАРОГІ, СЦЕЖКІ, КРАЯВІДЫ»

**(Віртуальную выставу падрыхтавала бібліятэкар 2-й катэгорыі Лапцева Л. Д.)**

